Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2012-10-12

Выпрабаванне настаўніцтвам

Мікола МІШЧАНЧУК

Некалі пад настрой напісалася, што слова "настаўнік" паходзіць не ад дыдактычнага "настаўляць", а ад філасофска-значнага, празрыста-чыстага, як лясная крынічка, "наталяць". Думалася тады, думаецца і цяпер, што з дзяцінства і да самых апошніх імгненняў жыцця чалавек наталяецца ведамі і звесткамі пра свет, у якім жыве, пазнае законы прыгажосці, гармоніі, вучыцца жыць па праўдзе, як неаднойчы гаварыў незабыўны Аляксандр Салжаніцын. Шчаслівы той, каго наталялі, вялі па сцяжынах жыцця настаўнікі. Вялі прафесійна, шчыра, аддаючы часцінку сваёй душы вучням. Так вёў мяне першы школьны настаўнік Аляксандр Аляксандравіч Севасцьянаў, былы вайсковец. Так наталяў ведамі пра лёс роднай мовы, яе гісторыю, пра сумленне як галоўны крытэрый паводзін, пра нераўнадушша і адданасць справе, якой служыш, камандзір партызанскай разведкі, слынны навуковец-лінгвіст, прафесар, пісьменнік Фёдар Міхайлавіч Янкоўскі. Так выхоўваў у зялёным пачатковцу, што многае не дабраў у вясковай школцы, прагу навуковага пошуку прафесар Сцяпан Ігнатавіч Карабан… Імёны настаўнікаў (амаль кожнага з іх правёў у апошні шлях) свецяцца для мяне зоркамі і сёння, калі маю сваіх вучняў, калі стаю на апошнім рубяжы.

Антон Аляксандравіч Семяновіч — мой настаўнік. Так, настаўнік. А затым ужо — калега, кіраўнік кафедры, з якім пражыты значны адрэзак часу, здзейснены многія планы і спадзяванні. Запомніліся яскравыя імгненні-залацінкі, якія ўжо ніколі не вернуцца, што грэюць сэрца і сёння…

Мінск. Лечкамісія. Трэці, калі не памыляюся, паверх. Ужо абараніўшыся, малады кандыдат навук, па рэкамендацыі Ф. Янкоўскага, нясу заяву загадчыку кафедры беларускай літаратуры з просьбай перавесці на яе з сумежнай кафедры рускага і замежнага слоўнага мастацтва. Да гэтага надрукаваў матэрыялы пра сувязь філасофскай лірыкі Я. Баратынскага з творчасцю А. Куляшова, Максіма Танка, "выдыхнуў" на старонкі часопіса "Народная асвета" радкі захаплення паэзіяй М. Багдановіча. Адным словам, пацягнула да бліжэйшага, роднага, беларускага. Было гэта, калі памяць не здраджвае, у далёкім 1973 годзе. Хваляваўся, перажываў: "А што, як не атрымаю згоду?" На шчасце, згоду-блаславенне я атрымаў. І думаю, што мой шаноўны настаўнік не пашкадаваў у далейшым, што заўважыў, падтрымаў навукоўца-пачаткоўца, пазначыў яму яго далейшы шлях…

У Мінскім педінстытуце імя А. М. Горкага кафедра беларускай літаратуры пад кіраўніцтвам прафесара А. Семяновіча (1971 — 1989) сталася важным звяном вучэбна-навуковага працэсу, заняла "свой пачэсны пасад" сярод іншых звёнаў універсітэта. Кіраўнік кафедры, як ён не раз гаварыў, стварыў сабе прыжыццёвы помнік — трохтомнае выданне падручніка "Гісторыя беларускай літаратуры" для студэнтаў філфакаў ВНУ рэспублікі, якое запатрабавана і сёння. Мала хто ведае, колькі высілкаў каштавала гэтая праца Антону Аляксандравічу і яшчэ аднаму майму настаўніку Міхаілу Арсенавічу Лазаруку: трэба было стварыць аўтарскі калектыў з супрацоўнікаў ВНУ Беларусі, Акадэміі навук, скласці канцэпцыю ва ўмовах перабудовы жыцця, пераацэнкі каштоўнасцей, пазбегнуць спрошчвання, сацыялагізацыі эстэтычных з'яў. З лёгкай рукі прафесара А. Семяновіча, пры яго бацькоўскай падтрымцы суаўтарамі выдання сталі маладыя навукоўцы А. Рагуля, М. Шаўлоўская і аўтар гэтых радкоў. Пры ім лёгка пісалася, вольна дыхалася. Ён ніколі нас не падганяў, не прыспешваў, шчыра радаваўся нашым поспехам. Запомніліся яго словы: "Працуйце, хлопцы, шукайце. Але не забывайцеся пра падручнік". Не забываліся, бралі з яго прыклад. Дзякуючы і яму была напісана і абаронена доктарская дысертацыя, стварыўся імідж навукоўцаў яго школы…

Многа сіл і энергіі аддаваў мой настаўнік працы на пасадзе кіраўніка секцыі беларускай літаратуры пры Навукова-метадычным савеце Міністэрства адукацыі. Запомніліся пасяджэнні ў Мінску, Мазыры, Брэсце, Магілёве, дыскусіі па праблемах навучання тэорыі і гісторыі літаратуры, напісання новых праграм, перагляду ранейшай перыядызацыі літаратурнага працэсу. Яскравымі, шчырымі былі выступленні У. Калесніка, М. Лазарука, М. Грынчыка, самога кіраўніка секцыі. Набіралася досведу, сталела моладзь, якая ўдзельнічала ў форумах, знаёмілася з ідэямі, што абараняліся старэйшымі калегамі…

Настаўнікі, старэйшыя калегі… Праз гады выразней бачыцца, адчуваецца іх нялёгкі шлях, іх лёсы — нязломных, сумленных людзей, якія ва ўмовах культу асобы Сталіна, хрушчоўскага валюнтарызму, брэжнеўскага застою пранеслі свой чалавечы гонар і прышчапілі маладзейшым веру ў перамогу дабра, гуманістычных ідэалаў…

Антон Аляксандравіч спавядаўся нам, а пазней — на старонках рэспубліканскага друку — пра нялёгкае дзяцінства, частка якога прайшла ў высылцы, у "раскулачанай нізавошта" сялянскай сям'і. Толькі выпадковасць — трапіў пад амністыю як малалетні і гадаваўся ў сям'і родзічаў — выратавалі яго ад больш суровых выпрабаванняў. У вайну быў партызанскім сувязным, разам з народнымі мсціўцамі набліжаў час перамогі над фашыстамі. Пасля вайны выпрабаванні працягваліся: давялося жыць, ужо супрацоўніку Акадэміі, разам з сям'ёй у галоўным будынку ўстановы разам з такімі ж бесхацінцамі. І пазней шлейф праследавання "кулацкага сына" цягнуўся за ім. Але перамагла праўда, нішто не змагло перашкодзіць навуковаму росту Антона Аляксандравіча: паспяхова абаронена доктарская дысертацыя пра беларускую даваенную драматургію, рэалізаваліся педагагічныя задумкі і планы падчас працы ў МПІ імя А. М. Горкага. Вялікай радасцю стала абарона кандыдацкай дысертацыі па хіміі дачушкай Інай. Палепшыліся бытавыя ўмовы пасля атрымання нармальнай кватэры…

У навуцы мой настаўнік быў першапраходцам… Першая манаграфія пра Максіма Гарэцкага належыць яму. Ён сказаў першае слова пра драматургію Міхася Чарота, Васіля Гарбацэвіча, Уладзіслава Галубка. Лягчэй было б ісці пратаптанымі сцежкамі, а ён сам іх працярэбліваў іншым, пры гэтым быў абачлівым, не "сек з пляча", як робяць сёння некаторыя маладыя даследчыкі.

Прафесар А. Семяновіч асабліва захапляўся старабеларускай літаратурай. Яго кумірамі былі Ф. Скарына, М. Гусоўскі, С. Будны. Удзячныя лектару студэнты-філолагі, паказвалі выдатныя веды па яго дысцыпліне…

За жыццё давялося паспытаць усяго майму настаўніку, калегу: і высылку, і працу слесарам на заводзе ў Мінску, і перапыненую вайной вучобу ў Мінскім педінстытуце імя А. М. Горкага, і выпрабаванні вайной, і нялёгкага хлеба аспіранта, а затым — навуковага супрацоўніка Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР (1946 — 1963). Ды самым ганаровым выпрабаваннем, што выпала на яго долю, было выпрабаванне настаўніцтвам. Доўжылася яно з 1963 па 1989 год, больш як чвэрць стагоддзя. Антон Аляксандравіч вытрымаў яго з годнасцю. І зрабіў не сёе-тое, як любіў гаварыць, а падрыхтаваў разам з калегамі глебу для ўсходаў на ніве асветы, якія ўскаласіліся буйным зернем. І гэтае зерне дало грунт для новых каласоў, для новых усходаў. І дзякуй яму за гэта…

Праз гады чую яго голас, трымаю ў памяці яго шырокую сялянскую ўсмешку, яго постаць, яго рухі, яго "ўказуючы перст". Праз гады ён застанецца Настаўнікам, што запаліў цяпельца веры ў душы не аднаго вучня…